Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (136), 2023

*УДК 930(4)«13/15»:378(470)-051:[94(4)«13/15»:35+32]*

# Эвалюцыя дзяржаўна-палітычнага ладу Вялікага княства Літоўскага ў даследаваннях выкладчыкаў вышэйшай школы Расійскай імперыі

І.В. Краўчанка

Артыкул прысвечаны разгляду праблемы трансфармацыі дзяржаўна-палітычнага ладу Вялікага княства Літоўскага ў XIV–XVI стст., у тым ліку розных аспектаў грамадска-палітычнага жыцця княства ў працах гісторыкаў – прадстаўнікоў вышэйшай школы Расійскай імперыі. Вызначана, што, дзякуючы даследаванням выкладчыкаў Імператарскіх універсітэтаў (Маскоўскага і Св. Уладзіміра ў Кіеве) пачатку XX ст., быў унесены значны ўклад у станаўленне сацыяльна-палітычнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага.
**Ключавыя словы:** гістарыяграфія, вышэйшая школа Расійскай імперыі, Вялікае княства Літоўскае, дзяржаўна-палітычны лад.

The article is devoted to the consideration of the problem of the transformation of the state-political system of the Grand Duchy of Lithuania in the 14th–16th centuries, including various aspects of the social and political life of the principality in the works of historians – representatives of the higher school of the Russian Empire. It was determined that, thanks to the research of the lecturers of the Imperial Universities (Moscow and St. Vladimir in Kiev) at the beginning of the 20th century, a significant contribution was made to the formation of the socio-political history of the Grand Duchy of Lithuania.
**Keywords:** historiography, higher school of the Russian Empire, the Grand Duchy of Lithuania, state political system.

Зварот расійскіх гісторыкаў да мінулага Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ) адбыўся ў першай трэці XIX ст. Далучэнне беларускіх зямель у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай прывяло да змен палітычных рэалій для Расійскай імперыі. Актуалізацыя навуковага інтарэсу да гісторыі ВКЛ была абумоўлена пашырэннем і паглыбленнем кантактаў з польскім гуманітарным асяроддзем. Атрымаўшы доступ да шырокай крыніцавай базы, выкладчыкі вышэйшай школы Расійскай імперыі актывізавалі даследаванні ў гэтай галіне, у прыватнасці, па праблеме дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ у XIV–XVI стст.

Сярод прадстаўнікоў вышэйшай школы Расійскай імперыі першую спробу ажыццявіць аналіз дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ распачаў М.М. Карамзін. Трансфармацыя дзяржаўнага ладу ВКЛ, на думку навукоўца, зводзілася да змен у палітычным светапоглядзе вялікіх князёў літоўскіх і наступствах для ўсходнеславянскіх зямель. Захаванне асноў ранейшага палітычнага ладу за межамі зямель уласна «Літвы» гісторык звязваў з праяўленнем разважлівасці і ўмеранасці вялікімі князямі літоўскімі. Сістэму адносін, якая склалался паміж вялікім князем літоўскім і ўдзельнымі рускімі князямі ў XV ст., М.М. Карамзін ахарактарызаваў як «падданства» [1, с. 157]. Разам з тым, завершанай сістэмы поглядаў па праблеме дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ гісторык не пакінуў, бо да гісторыі княства першай паловы XVI ст. ён практычна не звяртаўся.

У працах прафесара М.П. Пагодзіна, унутрыпалітычнае развіццё ВКЛ у другой чвэрці XV ст. паказана з пазіцыі дынамізму: палітычная раздробленасць ва ўдзельных княствах і землях трансфарміравалася ў самадзяржаўе, пры якім улада вялікага князя літоўскага над саюзам удзельных князёў стала неабмежаванай [2, с. 125]. Вучоны сцвярджаў, што ВКЛ раней за Вялікае княства Макоўскае дасягнула стадыі дзяржаўнай цэнтралізацыі.

У 1830-я гг. да праблемы эвалюцыі дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ звярнуўся М.Г. Устралаў. Гісторык распачаў спробу прымянення сістэмнага падыходу да палітычнага развіцця ВКЛ у XV – першай палове XVI стст. У сваіх навуковых працах ён імкнуўся прааналізаваць, якія змены ў палітычным развіцці ВКЛ прывялі яго да дзяржаўнага саюза з Каралеўствам Польскім у 1569 г., а не да зближэння з Расіяй.

М.Г. Устралаў быў салідарны з М.М. Карамзіным па пытанні аб вядучай ролі гаспадароў ВКЛ у вызначэнні накірунку гістарычнага развіцця княства. Для М.Г. Устралава ключавым у гісторыі ВКЛ быў выбар вялікага князя літоўскага Ягайлы на карысць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Каралеўства Польскага ў якасці палітычнага саюзніка ў апошняй чвэрці XIV ст. Навуковец падкрэсліў, што дзяржаўна-палітычны лад ВКЛ да заключэння Крэўскай уніі меў падабенства з ладам Вялікага княства Маскоўскага: вялікія князі літоўскія імкнуліся ўмацаваць уласную дынастыю, усталяваць адзінаасобнае кіраванне над усімі тэрытарыяльнымі адзінкамі княства. Разам з тым, XV – першая палова XVI стст. сталі перыядам росту польскага ўплыву на палітычную мадэль ВКЛ, сярод асаблівасцей якога гісторыкам былі вылучаны адсутнасць моцнай цэнтралізаванай улады манарха і праявы «свавольства» падданымі ва ўласнай дзяржаве [3, с. 208]. М.Г. Устралаў, перакладаючы адказнасць на польскі бок у пытанні трансфармацыі дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ, праецыраваў палажэнні тэорыі афіцыйнай народнасці.

Ідэі М.Г. Устралава былі станоўча ўспрыняты прафесарам Імператарскага Маскоўскага ўніверсітэта С.М. Салаўёвым. Пры гэтым, дэтальна прааналізаваўшы дзяржаўна-палітычны лад Каралеўства Польскага напярэдадні заключэння Крэўскай уніі, вучоны інакш у параўнанні з М.Г. Устралавым ахарактарызаваў польскі ўплыў на княства. На думку С.М. Салаўёва, у канцы XIV ст. у Каралеўстве панавала «шляхецкая воля», якая адыгрывала ролю сацыяльна-палітычнай сілы і ўплывала на палітычны лёс ВКЛ. Унутрыпалітычнае развіццё ВКЛ у XV ст. гісторыкам разглядалася ў нацыянальна-рэлігійнам кантэксце. Пры гэтым асноўны акцэнт у даследаванні быў зрушаны на супрацьстаянне літоўскіх князёў-католікаў і рускіх праваслаўных князёў. Наступны этап – першая палова XVI ст., з пункту гледжання С.М. Салаўёва, характарызаваўся барацьбой новых палітычных сіл: шляхты і «вяльможаў» [4, с. 772].

З прычыны водгуку рускай грамадскасці на Польскае паўстанне 1863–1864 гг. тэзіс аб паланізацыі ВКЛ зноў быў актуалізаваны. Гісторык М.О. Каяловіч развіў ідэю аб польскім уплыве на ВКЛ, якую першым прапанаваў М.Г. Устралаў. Тым не менш, даследчык лічыў, што інтэнсіўнае пранікненне ў ВКЛ польскіх парадкаў адбылося ў сувязі з заключэннем Люблінскай уніі. Гісторык не адмаўляў польскіх запазычанняў, адзначыўшы ўвядзенне ў ВКЛ польскіх пасад, адміністратыўнага падзеду па польскім узоры, з'яўленне сейма. На думку М.О. Каяловіча, дадзеныя новаўвядзенні мелі значэнне выключна для палітычнай эліты ВКЛ [5, с. 211].

Паводле М.О. Каяловіча, змены дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ адбываліся па ініцыятыве польскага боку, аднак, у далейшым збліжэнні з Каралеўствам Польскім былі зацікаўлены і літоўцы-каталікі. Такім чынам, навуковец узмацніў ролю і надаў значэнне рэлігійнаму фактару ў развіцці ВКЛ. На яго думку, страта незалежнасці ВКЛ адбывалася з прычыны таго, што на польскім і літоўскім троне знаходзіўся адзіны манарх, які перш за ўсё забяспечваў задавальненне інтарэсаў польскага боку, і гэтым адначасова наносіў шкоду княству.

Адным з першых даследчыкаў, які паставіў пад сумнеў ідэю аб польскім уплыве ў ВКЛ, быў К.М. Бястужаў-Румін. Ён звярнуў увагу на тое, што нормы Рускай Праўды былі зафіксіраваны ў Статутах ВКЛ, а таксама адлюстраваны ў граматах вялікага князя літоўскага Казіміра IV Кіеўскай і Валынскай землям. Навуковец прыйшоў да высновы, што ВКЛ, нягледзячы на падпісаны саюз з Каралеўствам Польскім, на працягу XV ст. уяўляла сабой «працяг рускага жыцця» [6, с. 206]. Тым не менш, дасканалай распрацоўкай канкрэтных пытанняў палітычнай гісторыі ВКЛ даследчык не займаўся, а пры трактоўцы гістарычнага развіцця княства прытрымліваўся папярэдніх навуковых традыцый.

Прадстаўнік Імператарскага ўніверсітэта Св. Уладзіміра У.Б. Антановіч падтрымаў сваіх папярэднікаў у аналізе ўдзельнай сістэмы ВКЛ XIV ст. Ён заявіў, што «Гедзімін раздаваў ва ўпраўленне членам свайго сямейства асобныя вобласці, прызнаючы за імі правы ўдзельных князёў, залежных ад галавы роду» [7, с. 76]. Пры гэтым гісторык прыйшоў да высновы, што палітычная сістэма, якая склалася ў ВКЛ, мела падабенства з заходнееўрапейскай, з уласцівымі апошняй феадальнымі парадкамі.

У.Б. Антановічам была прапанавана аўтарская канцэпцыя супрацьстаяння «двух народных пачаткаў» па пытанні аб барацьбе ўдзельных князёў і вялікага князя літоўскага. Згодна з палажэннямі канцэпцыі, «літоўскі пачатак», пры адсутнасці адзінадзяржаўнай улады, з'яўляўся антыдзяржаўным, а «рускі пачатак» – наадварот, дзяржаваўтваральным. У выніку перавага ў ВКЛ «літоўскага пачатку» прывяла да паслаблення дзяржавы. Зыходзячы з прапанаванай трактоўкі У.Б. Антановіча, захаванне дзяржаўнасці і рост магутнасці ВКЛ быў магчымы толькі дзякуючы прыняццю вялікімі князямі літоўскімі «рускіх пачаткаў».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тэзіс аб польскім уплыве на грамадства ВКЛ у першай палове XVI ст. развіваў Дз.І. Ілавайскі, што, разам з прыняццем ім канцэпцыі супрацьстаяння «літоўскай і рускай партый» сведчыць аб падтрымцы навукоўцам канцэпцыі нацыянальна-рэлігійнага канфлікту ў ВКЛ [8, с. 275–276]. Разам з тым, «падаўжэнне» гісторыкам палажэння аб барацьбе вялікага князя літоўскага з удзельнымі князямі да другой паловы XV ст. сведчыла аб яго адступленні ад традыцыйных поглядаў на праблему дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ, таму канцэпцыю Дз.І. Ілавайскага ў гістарычнай навуцы можна ахарактарызаваць як пераходную.

У сярэдзіне 1890-х гг. паміж Ф.І. Леантовічам і М.К. Любаўскім разгарнулася дыскусія, якая мела сваім вынікам перагляд устойлівых поглядаў на палітычны лад ВКЛ. Галоўным вывадам М.К. Любаўскага ў яго магістэрскай дысертацыі стала палажэнне аб федэратыўным, а не ўдзельным ладзе ВКЛ у XIV–XV стст., які ўяўляў сабой федэратыўнае аб'яднанне старажытнарускіх зямель з Літвой. На думку гісторыка, асобныя рускія землі ў XV – пачатку XVI стст. з'яўляліся аўтаномнымі адзінкамі, аб'яднанымі пад намінальным вяршэнствам Літвы. М.К. Любаўскі распачаў спробу абвергнуць ідэі канцэпцыі польскага ўплыву на ВКЛ. Так, гісторык не пагадзіўся з тэзісам аб «польскай існасці», якую ўспрымалі вялікія князі літоўскія. Паводле М.К. Любаўскага, слабасць вялікакняжацкай ўлады, а таксама рост палітычнай магутнасці старажытнарускіх зямель абумовілі немагчымасць цэнтралізацыі ў ВКЛ [9, с. 352].

М.К. Любаўскі галоўную ролю ў працэсе ліквідацыі ўдзельнай сістэмы ў ВКЛ адводзіў вялікакняжацкай уладзе, што супадала з меркаваннямі Дз.І. Ілавайскага аб барацьбе вялікага княства літоўскага з удзельнымі князямі ў ВКЛ да другой паловы XV ст. Гісторык вызначыў матэрыяльную зацікаўленасць вялікакняжацкай улады ў ліквідацыі ўдзельных уладанняў, а не канфесійны фактар.

У супрацьлегласць М.К. Любаўскаму, гісторык, выкладчык Імператарскага ўніверсітэта Св. Уладзіміра Ф.І. Леантовіч прапанаваў уласную канцэпцыю эвалюцыі дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ. У самастойнасці старажытнарускіх зямель у складзе ВКЛ гісторык падкрэсліваў выключна «разнадумнасць удзелаў паміж асобнымі літоўска-рускімі абласцямі» [10, с. 33]. У працэсе цэнтралізацыі ўлады ў ВКЛ галоўнай перашкодай, на думку Ф.І. Леантовіча, была фігура вялікага князя, якая не ўсведамляла прынцыпаў адзінадзяржаўя. Неабходна адзначыць, што ў дадзеным пытанні гісторык вярнуўся на пазіцыі сваіх папярэднікаў, якія бачылі ў асабістых якасцях гаспадароў ВКЛ прычыны і наступствы гістарычнага развіцця дзяржавы. Пры тлумачэнні прычын ліквідацыі ўдзельнай сістэмы гісторык адзначаў рост палітычнага ўплыву магнатаў у ВКЛ.

Высновы М.К. Любаўскага выглядаюць больш пераканальнымі ў параўнанні з высновамі Ф.І. Леантовіча ў прымяненні да гісторыі ВКЛ XV–XVI стст. Пры гэтым гісторык прыйшоў да высновы, што ўдзелаў у ВКЛ не існавала ўжо ў XIV ст., бо тыя княжанні, якія атрымлівалі ва ўладанне нашчадкі вялікага князя Гедзіміна, пераходзілі ад аднаго князя да другога ў залежнасці ад замацавання за новай княжацкай дынастыяй далучаных тэрыторый. Адносна палітычнага ладу ВКЛ XIV ст. М.К. Любаўскі выкарыстаў тэрмін «кангламерат зямель і ўладанняў», паміж якімі, на думку даследчыка, адсутнічала якая-небудзь салідарнасць [11, с. 176].

З М.К. Любаўскім у трактоўцы дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ у XIV ст. быў згодны М.С. Грушэўскі. Ён таксама лічыў княства слаба цэнтралізаваным і тлумачыў гэта наступным чынам: «Пры ўсёй надзвычайнай экстэнсіўнасці Літоўская дзржава была слаба арганізаванай: шматлікія землі не былі сканцэнтраваны ў адзін моцны арганізм» [12, с. 138]. Гісторык вылучыў новы перыяд у гісторыі ВКЛ, храналагічна датаваўшы яго пачаткам 1390-х гг. Пры яго характарыстыцы М.С. Грушэўскі падкрэсліў умацаванне цэнтральнай улады пры вялікім князі літоўскім з прычыны замены ў найбуйнейшых старажытнарускіх землях князёў літоўскімі намеснікамі, што спрыяла ўнутранай палітычнай еднасці ВКЛ.

Праблема ўзнікнення сейма ў ВКЛ была разгледжана ў доктарскай дысертацыі М.К. Любаўскага. На думку даследчыка, з'яўленню сейма садзейнічала некалькі абставін: недастатковая палітычная сталасць вялікакняжацкай улады, а таксама ўплыў традыцый, якія існавалі ў Каралеўстве Польскім. Неабходна адзначыць, што пры аналізе дадзенага пытання М.К. Любаўскі часткова падтрымаў ідэю аб польскім уплыве. Тым не менш, гісторык адышоў ад традыцыйнага гістарыяграфічнага падыходу. М.К. Любаўскі фактычна сцвярджаў, што яшчэ да заключэння Крэўскай уніі ў ВКЛ самостойна былі створаны і існавалі структуры, падобныя на польскія. З гэтага вынікала, што меркаванне аб поўным запазычанні палітычных інстытутаў з Каралеўства Польскага не вытрымлівала крытыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Перагледзеўшы канцэпцыю палітычнай гісторыі ВКЛ першай паловы XV ст., М.К. Любаўскі сцвярджаў, што ў гэты перыяд адбывалася барацьба паміж абласцямі – Літвой і рускімі землямі, а не паміж удзельнымі князямі за велікакняжацкі прастол. Пры гэтым, гісторык выключыў фактар нацыянальна-рэлігійнай барацьбы ў дадзеным працэсе.

Пад уплывам высноў, зробленых М.С. Грушэўскім, М.К. Любаўскі адзначыў рост ступені дзяржаўнай цэнтралізацыі ў перыяд княжання Вітаўта. На змену федэратыўнаму ўтварэнню «Літоўская зямля – рускія вобласці» М.К. Любаўскі сфармуліраваў больш складанае ўяўленне аб сацыльяна-палітычным ладзе ВКЛ як аб кампрамісе паміж вялікакняжацкай уладай і «літоўска-рускім панствам» – прадстаўнікамі літоўскай знаці з ліку буйных землеўладальнікаў і княжацка-баярскай знаці рускіх зямель [11, с. 85].

Такім чынам, погляды выкладчыкаў вышэйшай школы Расійскай імперыі на праблему дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ прайшлі значную эвалюцыю. Іх зыходнымі момантамі сталі тэзісы аб ідэнтычнасці палітычнага ладу ВКЛ і Вялікага княства Маскоўскага, трансфармацыі першага ў накірунку канцэнтрацыі ў князя вярхоўнай улады, спыненым ростам польскага грамадска-палітычнага ўплыву, што ў выніку прывяло да паслаблення дзяржавы. Адмысловае значэнне маюць погляды У.Б. Антановіча, якія спалучаюць ідэі дзяржаўнай школы на прыкладзе буйнейшага прадстаўніка С.М. Салаўёва і арыгінальныя тэарэтычныя ўяўленні пра барацьбу «двух народных пачаткаў».

У 1890-я гг. сярод прадстаўнікоў вышэйшай школы Расійскай імперыі пачаўся адыход ад пануючай традыцыйнай гістарыяграфіі. Вынікам навуковай дыскусіі паміж Ф.І. Леантовічам і М.К. Любаўскім стаў перагляд канцэптуальных уяўленняў па праблеме дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ. М.К. Любаўскі пераканаўча абвергнуў уяўленні пра ўдзельны лад ВКЛ і атрымаў падтрымку большасці навукоўцаў.

Узнікненне завершанай канцэпцыіі дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ, якая ўлічвала розныя гістарычныя дадзеныя, варта адносіць да 1910-х гг. Дзякуючы даследаванням М.К. Любаўскага, падвергліся крытычнаму перагляду палажэнні, якія былі сфармуліраваны да пачатку XX ст., у тым ліку і ўласныя ідэі гісторыка.

## Літаратура

1. Карамзин, Н. М. История государства Российского : 12 т. / Н. М. Карамзин. – СПб. : Типография Н. Греча, 1816–1829. – Т. 5. – 1819. – 699 с.

2. Погодин, М. П. Начертание русской истории. Для гимназий / М. П. Погодин. – 2-е изд. – М. : Университетская типография, 1837. – 408 с.

3. Устрялов, Н. Г. Русская история до 1855 г. / Н. Г. Устрялов. – Петрозаводск : Фолиум, 1997. – 958 с.

4. Соловьёв, С. М. История России с древнейших времен : в 6 кн. / С. М. Соловьёв. – СПб. : Товарищество «Общественная польза», 1851–1879. – Кн. 1. – 1851. – 879 с.

5. Коялович, М. О. Чтения по истории Западной России / М. О. Коялович. – СПб. : Типография С. П. Суворина, 1884. – 465 с.

6. Бестужев-Рюмин, К. Н. Русская история : в 2 т. / К. Н. Бестужев-Рюмин. – СПб. : Типография А. Траншеля, 1872–1885. – Т. 1. – 1872. – 760 с.

7. Антонович, В. Б. Монографии по истории Западной и Юго-Западной России / В. Б. Антонович. – Киев : Типография Е. Я. Федорова, 1885. – 355 с.

8. Иловайский, Д. И. История России : в 5 т. / Д. И. Иловайский. – М. : Типография М. Лебедева, 1876–1905. – Т. 2. – 1896. – 611 с.

9. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого литовского статута / М. К. Любавский. – М. : Университетская типография, 1892. – 998 с.

10. Леонтович, Ф. И. Очерки истории литовско-русского права / Ф. И. Леонтович. – СПб. : Типография В. С. Балашева и К°, 1894. – 401 с.

11. Любавский, М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М. К. Любавский. – 2-е изд.– М. : Художественная типография, 1915. – 405 с.

12. Грушевский, М. С. Очерк истории украинского народа / М. С. Грушевский. – СПб. : Товарищество «Общественная польза», 1904. – 382 с.

Могилевский государственный
университет имени А.А. Кулешова

Поступила в редакцию 28.09.2022

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ